# Нашы юбіляры

## АЛЯКСЕЙ АРСЕНЦЬЕВІЧ ВОЛК
### (Да 60-годдзя з дня нараджэння)



Жыццёвы і творчы шлях Аляксея Арсенцьевіча Волка — у перапляценні двух пачаткаў: уласна навукова-даследчага і таго, які звязаны з арганізацыяй навукі. Сам па адукацыі журналіст, А. А. Волк стаў адным з першых даследчыкаў гісторыі беларускай кнігі, аўтарам і сааўтарам многіх даследаванняў у гэтай вобласці, асноўнымі з якіх з'яўляюцца «Книгоиздательское дело в Белоруссии» (Минск, 1961), кніга «Исследования и материалы» (Москва, 1965) і іншыя. Шэраг артыкулаў А. А. Волка — у працяг развіцця вывучэння ўсё той жа гісторыі старабеларускай і ўвогуле беларускай кнігі — у 70—80-я гады з'явіліся на старонках такіх вядучых часопісаў рэспублікі, як «Коммунист Белоруссии», «Полымя» і іншых. У выніку імя А. А. Волка значыцца сярод першых і прыярытэтных даследчыкаў справы нашчадкаў вялікага першадрукара Беларусі Францішка Скарыны — той вялікай часткі нацыянальнай культуры беларускага народа, якая ёсць у ёй падвалíннай, першаснай асновай, фундаментальнай.

Ды яшчэ большыя заслугі перад нацыянальнай культурай у А. А. Волка як арганізатара навукі, якім ён стаў напачатку як дырэктар выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна (1954—1959), а затым як намеснік дэкана філалагічнага факультэта (1964—1967) і яго дэкан. Менавіта на гэтых пасадах шырока разгарнуліся арганізатарскія здольнасці А. А. Волка, звязаныя, з аднаго боку, з яго разуменнем перспектыў развіцця ў рэспубліцы філалогіі ва ўсіх яе гатунках і кірунках, з другога — з уменнем працаваць з людзьмі, не шкадаваць ім падтрымкі, даверу, усямернага спрыяння — кожнаму, хто ідзе ў навуку, робіць у ёй ці першыя крокі, ці бярэ бар'ер доктарскай дысертацыі, ці прагне падтрымкі ў напісанні чарговых падручніка, манаграфіі, навуковага практыкума і г. д.

Шырыню погляду, ініцыятыўнасць А. А. Волку даў не толькі родны БДУ імя У. І. Леніна, які ён скончыў у 1954 годзе. А. А. Волк — родам з былой заходняй Беларусі, з Брэстчыны. Ды ён жа родам і з сям'і аднаго з актыўных удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху былой Заходняй Беларусі. Сын члена КПЗБ, А. А. Волк ужо ва універсітэт паступаў членам КПСС. І гэта толькі дзякуючы свайму грамадзянскаму тэмпераменту і грамадскай актыўнасці. А. А. Волк і быў абраны ў свае 29 год сакратаром парткома БДУ імя У. І. Леніна. Такога маладога сакратара парткома пасляваенны універсітэт не меў ні да асобы А. А. Волка на гэтай пасадзе, ні пасля ягонага сакратарства!

З Аляксеем Арсенцьевічам Волкам як нязменным на працягу больш чым 20 год дэканам можа паспрачацца хіба толькі адзін з дэканаў нашага універсітэта ўсяго пасляваеннага часу М. Т. Раманоўскі — дэкан геафака. Знамянальна таксама тое, што і летась большасцю галасоў калектыву філалагічнага факультэта А. А. Волк зноў абраны дэканам. Такое прызнанне калектыву не можа быць беспадстаўным, і яго А. А. Волк цалкам заслужыў менавіта дзякуючы нявычэрпнасці сваіх здольнасцей кіраўніка: сваёй улюбёнасцю ў філфак і спрыяльнасцю, шчыраваннем як у фарміраванні душ навучэнцаў філфака, так і ў штодзённай клапатлівай абыходлівасці з кожным супрацоўнікам такога вялікага і складанага калектыву, якім з'яўляецца факультэт, на чале якога прадаўжае заставацца Аляксей Арсенцьевіч і якому ўсім сэрцам пажадаем жа новых здзяйсненняў у навуцы, у яе арганізацыі, у нястомнай падрыхтоўцы новых пакаленняў філолагаў.

**А. А. Лойка**